Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Вучэбна-метадычнае аб'яднанне
па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНСТРУМЕНТАЗНАЎСТВА І ІНСТРУМЕНТОЎКА

*Тыпавая вучэбная праграма для ўстаноў вышэйшай адукацыі
па спецыяльнасці 1-18 01 01
Народная творчасць (па напрамках),
напрамку спецыяльнасці 1-18 01 01-02
Народная творчасць (інструментальная музыка)*

Мінск
БДУКМ
2015

**СКЛАДАЛЬНІК**

*В. У. Мазанік,* загадчык кафедры народна-інструментальнай творчасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*кафедра* інструментоўкі ўстановы адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі»;

*С. А. Руткевіч,* дацэнт кафедры культуралогіі і псіхолага-педагагічных дысцыплін ДУА «Інстытут культуры Беларусі», кандыдат мастацтвазнаўства

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ Ў ЯКАСЦІ ТЫПАВОЙ:**

*кафедрай* народна-інструментальнай творчасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 8 ад 28.03.2014 г.);

*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 5 ад 18.06.2014 г.);

*навукова-метадычным саветам* па народнай творчасці Вучэбна-метадычнага аб’яднання па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў (пратакол № 2 ад 27.06.2014 г.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказны за выпуск: В. У. Мазанік

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Тыпавая вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне «Інструментазнаўства і інструментоўка» распрацавана для ўстаноў вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарту па спецыяльнасці 1-18 01 01 Народная творчасць (па напрамках). Вучэбная дысцыпліна «Інструментазнаўства і інструментоўка» займае вядучае месца сярод прафілюючых дысцыплін напрамку спецыяльнасці 1-18 01 01-02 Народная творчасць (інструментальная музыка) і адыгрывае значную ролю ў фарміраванні прафесійных якасцей спецыялістаў.

Эфектыўнасць выкладання вучэбнай дысцыпліны «Інструментазнаўства і інструментоўка» забяспечваецца шляхам утварэння міжпрадметных сувязей як з дысцыплінамі спецыялізацыі, так і з агульнанавуковымі, агульнапрафесійнымі. Так, раздзелы «Гармонія», «Поліфанія», «Аналіз музычных форм» вучэбнай дысцыпліны «Тэорыя музыкі» забяспечваюць музычна-тэарэтычны падмурак гэтай дзейнасці; «Аркестравы клас» – магчымасць апрабацыі створаных партытур; «Дырыжыраванне» фарміруе ў студэнта пэўны ўзровень прафесійнай падрыхтоўкі.

Асноўная *мэта* вучэбнай дысцыпліны «Інструментазнаўства і інструментоўка» – развіццё творчых здольнасцей асобы на падставе стварэння ўласных інструментовак, аранжыровак і пералажэнняў для розных па складзе аркестраў і ансамбляў.

Рэалізацыя пастаўленай мэты вызначае *задачы* вучэбнай дысцыпліны, якая складаецца з трох асноўных раздзелаў. Першы раздзел «Інструментазнаўства» вырашае свае задачы: вывучэнне інструментальнага складу аркестраў і ансамбляў, канструкцыі музычных інструментаў, тэхнічных і мастацкіх магчымасцей, тэмбравых характарыстык, строю, дыяпазону, прыёмаў ігры, штрыхоў. Другі раздзел «Тэорыя інструментоўкі» прадугледжвае вывучэнне тэарэтычных асноў інструментоўкі, аранжыроўкі і пералажэння (паняцце фактуры і яе састаўныя часткі, асноўныя прыёмы і прынцыпы інструментоўкі). Задачамі трэцяга раздзела «Практычная інструментоўка» з'яўляюцца фарміраванне і развіццё практычных навыкаў і ўменняў, неабходных для будучай прафесійнай дзейнасці: выкарыстанне розных прыёмаў аркестравага і ансамблевага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пісьма для ўвасаблення ў партытуры мастацкага зместу твора, а таксама выхаванне творчых адносін да дзейнасці інструментоўшчыка як спецыяліста ў галіне музычнай культуры і мастацтва.

Засваенне вучэбнай дысцыпліны «Інструментазнаўства і інструментоўка» павінна забяспечыць фарміраванне наступных груп кампетэнцый.

**Акадэмічныя кампетэнцыі.**

Спецыяліст павінен:

АК-2. Валодаць сістэмным і параўнальным аналізам.

АК-4. Умець працаваць самастойна.

**Сацыяльна-асобасныя кампетэнцыі.**

Спецыяліст павінен:

САК-5. Быць здольным да крытыкі і самакрытыкі.

САК-8. Праяўляць ініцыятыву, у тым ліку ў нестандартных сітуацыях.

**Прафесійныя кампетэнцыі.**

Спецыяліст павінен быць здольным:

ПК-24. Працаваць з крыніцамі рэпертуару, літаратурай па народнай творчасці.

ПК-26. Выступаць у якасці акцёра-выканаўцы ў прафесійных і аматарскіх музычных калектывах, драматычных тэатрах, музычных тэатрах, тэатрах-студыях, на радыё, тэлебачанні, у канцэртных установах.

ПК-27. Рабіць уласныя аранжыроўкі, інструментоўкі, апрацоўкі і пералажэнні для харавых калектываў, аркестраў, ансамбляў.

ПК-28. Самастойна падбіраць рэпертуар, фарміраваць канцэртную праграму.

ПК-29. Рыхтаваць творчыя выступленні харавых (інструментальных) калектываў і весці канцэртную работу ў рэгіёне і па-за яго межамі.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен

*ведаць*:

– гісторыю і тэорыю інструментазнаўства;

– класіфікацыю, функцыянальныя і мастацка-выканальніцкія асаблівасці пэўнага складу аркестраў ці ансамбляў;

– тэорыю інструментоўкі;

– прынцыпы і прыёмы інструментоўкі, аранжыроўкі, пералажэння, апрацоўкі;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*умець:*

– напісаць інструментоўку для пэўнага складу аркестра ці ансамбля;

– адаптаваць партытуру да наяўнага складу аркестра ці ансамбля;

– дакладна афармляць партытуры згодна з патрабаваннямі;

*валодаць:*

– тэхналогіяй інструментоўкі для народных аркестраў (ансамбляў);

– асноўнымі спосабамі арганізацыі аркестравай (ансамблевай) фактуры;

– асноўнымі прынцыпамі графічнага афармлення партытур.

У адпаведнасці з тыпавым вучэбным планам на вывучэнне дысцыпліны «Інструментазнаўства і інструментоўка» ўсяго адведзена 194 гадзіны, з якіх 137 гадзін – аўдыторныя заняткі. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: лекцыі – 30 гадзін, семінары – 6 гадзін, індывідуальныя заняткі – 101 гадзіна. Рэкамендаваныя формы кантролю ведаў студэнтаў – залік, экзамены.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Раздзелы і тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | |
|---|---|---|---|
| | лекцыі | семінар. заняткі | індывід. заняткі |
| **Раздзел I. Інструментазнаўства** | | | |
| *Тэма 1.* Мэта і задачы раздзела «Інструментазнаўства». Агульныя звесткі аб гісторыі развіцця аркестра | 2 | | |
| *Тэма 2.* Інструментальны склад сімфанічнага аркестра | 6 | 2 | |
| *Тэма 3.* Беларускі народны аркестр | 2 | | |
| *Тэма 4.* Аркестр рускіх народных інструментаў | 2 | | |
| **Раздзел II. Тэорыя інструментоўкі** | | | |
| *Тэма 5.* Аркестравая фактура як сродак мастацкай выразнасці. Аркестравыя функцыі | 2 | 2 | |
| *Тэма 6.* Клавір і яго асаблівасці. Гарызантальны і вертыкальны аналіз клавіра | 2 | | |
| *Тэма 7.* Асноўныя спосабы арганізацыі аркестравай (ансамблевай) фактуры | 2 | | |
| *Тэма 8.* Тэхналогія інструментоўкі для народных аркестраў (ансамбляў) | 2 | | |
| *Тэма 9.* Інструментоўка акампанементу | 2 | | |
| *Тэма 10.* Асноўныя прынцыпы графічнага афармлення партытур | 2 | | |
| **Раздзел III. Практычная інструментоўка** | | | |
| *Тэма 11.* Інструментоўка для беларускага народнага аркестра, аркестра рускіх народных інструментаў і ансамбляў народных інструментаў | 4 | 2 | 85 |
| *Тэма 12.* Пералажэнне сімфанічных партытур для аркестраў і ансамбляў народных інструментаў | 2 | | 16 |
| **Усяго …** | **30** | **6** | **101** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## Раздзел І. Інструментазнаўства

### *Тэма 1. Мэта і задачы раздзела «Інструментазнаўства». Агульныя звесткі аб гісторыі развіцця аркестра*

Інструментазнаўства як навука, мэта якой – набыццё ведаў аб паходжанні і гісторыі развіцця акадэмічных і народных музычных інструментаў, іх тэмбравых, акустычных і музычна-выразных магчымасцях. Задачы: вывучэнне інструментальнага складу аркестраў і ансамбляў, канструкцыі музычных інструментаў, тэхнічных магчымасцей (строй, дыяпазон, натацыя, рэгістры), прыёмаў гуказдабывання, штрыхоў.

Найбольш вядомыя сістэмы класіфікацыі музычных інструментаў. Міжнародная класіфікацыя па сістэме Э. Хорнбостэля – К. Закса, асноўныя крытэрыі якой: а) крыніца гуку (групавая прымета); б) спосаб яго здабывання (відавая прымета).

Гістарычная эвалюцыя зместу паняцця «аркестр». Асноўныя віды аркестраў: сімфанічны, камерны, духавы, эстрадны, народны. Інструментальныя ансамблі і іх віды. Нацыянальныя аркестры і ансамблі. Дзяленне аркестраў і ансамбляў на змешаныя і аднародныя саставы.

### *Тэма 2. Інструментальны склад сімфанічнага аркестра*

Гісторыя ўзнікнення і развіцця сімфанічнага аркестра. Дзяленне сімфанічнага аркестра па складзе на струнны, малы (камерны), вялікі (парны, трайны, чацвярны). Асноўныя прынцыпы сістэмы партытурнага запісу пэўнага складу аркестра.

Асобныя групы аркестра: драўляная духавая, медная духавая, ударная, клавішна-шчыпковая, струнна-смычковая. Функцыі аркестравых груп і асобных інструментаў у аркестры. Строй, дыяпазон, рэгістры, прыёмы гуказдабывання, штрыхі, тэхнічныя і мастацка-выразныя магчымасці. Транспаніруючыя інструменты сімфанічнага аркестра.

Інструменты сімфанічнага аркестра, якія выкарыстоўваюцца ў народна-інструментальных саставах: драўляныя духавыя (флейта, габой, кларнет), ударныя (інструменты з пэўнай вышынёй гучання і інструменты без пэўнай вышыні гучання), струнна-смычковыя (скрыпка, альт, віяланчэль, кантрабас). Эпізадычнае выкарыстанне медных духавых інструментаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асаблівасці выкарыстання акадэмічных музычных інструментаў у народна-інструментальных аркестрах і ансамблях.

*Тэма 3. Беларускі народны аркестр*

Эвалюцыя інструментальнага складу беларускага народнага аркестра. Склад сучасных беларускіх народных аркестраў: малы, вялікі, фальклорны. Асноўныя прынцыпы сістэмы партытурнага запісу пэўнага складу аркестра.

Характарыстыка асноўных груп аркестра: дудкі (сапрана, альт, тэнар, бас); акадэмічныя драўляныя духавыя інструменты (флейта, габой, кларнет); баяны; ударныя інструменты сімфанічнага аркестра (літаўры, трохвугольнік, бубен, малы барабан, талеркі, вялікі барабан, ксілафон, званочкі, званы і інш.) і народныя (шумавыя); цымбалы (прымы, альты-тэнары). Выкарыстанне ў аркестры бас-гітары. Эпізадычныя інструменты беларускага народнага аркестра (ліра, дуда, акарына, жалейка, чаротка і інш.). Асаблівасці выкарыстання ў беларускім народным аркестры струнна-смычковай групы.

Функцыі аркестравых груп і асобных інструментаў у аркестры. Строй, дыяпазон, рэгістры, прыёмы гуказдабывання, штрыхі, тэхнічныя і мастацка-выразныя магчымасці інструментаў беларускага народнага аркестра.

Склад сучасных ансамбляў народных інструментаў: дзяленне ансамбляў на змешаныя і аднародныя саставы.

*Тэма 4. Аркестр рускіх народных інструментаў*

Эвалюцыя інструментальнага складу аркестра рускіх народных інструментаў. Сучасныя аркестры рускіх народных інструментаў: струнны састаў (групы домраў і балалаек); струнны састаў з групай баянаў, гуслямі і групай ударных інструментаў; аркестр рускіх народных інструментаў з групай драўляных духавых інструментаў (флейта, габой, кларнет).

Характарыстыка асноўных груп аркестра: домры (трохструнныя, чатырохструнныя); акадэмічныя драўляныя духавыя інструменты; баяны і аркестравыя гармонікі (сапрана, альт, тэнар, бас, кантрабас); ударныя інструменты сімфанічнага аркестра (літаўры, трохвугольнік, бубен, талеркі, малы і вялікі барабаны); балалайкі (прымы, секунды, альты, басы, кантрабасы). Асаблівасці выкарыстання народных духавых (жалейкі, ражкі, дудкі, кугіклы) і ўдарных (лыжкі, трашчоткі, званочкі і інш.) інструментаў, групы акардэонаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Функцыі аркестравых груп і асобных інструментаў у аркестры. Строй, дыяпазон, рэгістры, прыёмы гуказдабывання, штрыхі, тэхнічныя і мастацка-выразныя магчымасці інструментаў рускага народнага аркестра.

Распаўсюджанасць аркестраў рускіх народных інструментаў на тэрыторыі Беларусі і іх спецыфіка (увядзенне ў склад аркестра цымбалаў і іншых беларускіх народных інструментаў).

## Раздзел II. Тэорыя інструментоўкі

### *Тэма 5. Аркестравая фактура як сродак мастацкай выразнасці. Аркестравыя функцыі*

Паняцце музычнай фактуры як сукупнасці прыёмаў падачы музычнага матэрыялу, пабудовы музычнай тканіны. Драматургія твора і музычная фактура як узаемазвязаныя сродкі музычнай выразнасці. Кампаненты (элементы) музычнай фактуры: мелодыя, бас, гармонія (педаль, фігурацыя), кантрапункт, падгалосак. Віды музычнай фактуры: меладычная (манадычная і поліфанічная), гамафонна-гарманічная, акордавая, змешаная.

Паняцце аркестравай фактуры. Элементы аркестравай фактуры меладычнай групы (мелодыя, кантрапункт, падгалосак). Элементы аркестравай фактуры акампанементнай групы (бас, гарманічная фігурацыя, гарманічная педаль).

Характарыстыка элементаў фактуры. Мелодыя як вядучы элемент аркестравай фактуры. Прыёмы выкладання мелодыі ў партытуры: аднагалоссе, падвойванні, дубліроўкі, акордавае правядзенне, тэмбравае, рэгістравае і дынамічнае выдзяленне. Кантрапункт і яго разнавіднасці (імітацыя, падгалосак, кантрасная тэма).

Бас як падмурак аркестравай фактуры. Віды баса: просты функцыянальны, бас-асціната, фігураваны, меладызаваны. Фігурацыя і яе віды: рытмічная, гарманічная, меладычная, рытмагарманічная. Педаль як выключна аркестравая функцыя акампанементнай групы. Віды педалі: вытрыманая, фігуратыўная, каларыстычная, дэкаратыўная.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 6. Клавір і яго асаблівасці .*
*Гарызантальны і вертыкальны аналіз клавіра*

Інструментоўка як прыстасаванне гучання твора да новых, у параўнанні з арыгіналам, умоў. Клавір як арыгінальны твор для фартэпіяна, баяна, акардэона, прапануемы для інструментоўкі.

Інструментоўка фартэпіянных твораў і спецыфіка фартэпіяннай фактуры. Узаемасувязь фактуры твора з канструкцыяй інструмента. Канструктыўныя асаблівасці фартэпіяна: ударная прырода гуку; вялікі дыяпазон і тэхнічныя магчымасці; наяўнасць педалей, якія падаўжаюць гучанне. Перапрацоўка асобных элементаў музычнай фактуры (мелодыя, фігурацыя, бас) пры рабоце з фартэпіянным клавірам.

Інструментоўка твораў, напісаных для баяна (акардэона). Спецыфіка баяннага (акардэоннага) клавіра. Канструктыўныя асаблівасці баяна (акардэона): магчымасць з дапамогай меха кіраваць гукам на любым адрэзку гучання, будаваць доўгую фразу ці склад.

Аналіз гарызантальнага развіцця і вертыкальнага складу музычнай тканіны клавіра. План гарызантальнага аналізу клавіра ўключае вывучэнне формы твора, дынамічнага плана, дыяпазону мелодыі па раздзелах формы, тэмбравае развіццё мелодыі ў залежнасці ад формы, дынамікі, дыяпазону. План вертыкальнага аналізу клавіра ўключае выдзяленне мелодыі, кантрапункта, падгалоска, басовага голасу, фігурацыі, педалі.

*Тэма 7. Асноўныя спосабы арганізацыі аркестравай*
*(ансамблевай) фактуры*

Узаемасувязь аркестравага (ансамблевага) фактураўтварэння з асноўнымі палажэннямі тэорыі музыкі, гармоніі, поліфаніі, аналізу музычных форм.

Асноўныя прыёмы інструментоўкі. Голасавядзенне як галоўны сродак якаснага аркестравага гучання. Асаблівасці голасавядзення. Прынцып кампенсацыі, ладавага імкнення, прынцып выкладання акордавай паслядоўнасці ў аркестравых галасах. Граматнае вырашэнне дысанансаў.

Асаблівасці перапрацоўкі фартэпіяннай, баяннай фактуры з улікам спецыфічных асаблівасцей канструкцыі інструментаў, дыяпазону, выканальніцкіх магчымасцей: запаўненне, дубліроўка, «яруснае» выкладанне тэматычнага матэрыялу, падвойванні, наяўнасць поўнай гармоніі ў кожнай з аркестравых груп

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пры выкананні гарманічнай функцыі, пераасэнсаванне штрыхоў, фактурна-дынамічныя пераўтварэнні.

Тэхніка выкарыстання тэмбраў у аркестры. Традыцыйныя і нетрадыцыйныя спалучэнні, абумоўленыя выяўленчым пачаткам і кантэкстам твора. Прыём «агульнага тэмбру» пры перадачы меладычнага малюнка.

Спецыфіка ансамблевай фактуры: раўнацэнныя ў тэхнічных і мастацкіх адносінах партыі. Спосабы фактураўтварэння пры інструментоўцы твора для ансамбля. Гукавышынныя і тэмбравыя суадносіны інструментаў у ансамблях рознага складу. Прынцыпы запісу партытуры для ансамбля.

### *Тэма 8. Тэхналогія інструментоўкі для народных аркестраў (ансамбляў)*

Тэхналогія стварэння інструментоўкі (партытуры для аркестра ці ансамбля) уключае пяць асноўных этапаў работы:

першы этап – падбор рэпертуару;

другі этап – аваладанне тэорыяй інструментоўкі і тэхнікай аркестравага (ансамблевага) пісьма;

трэці этап – стварэнне плана інструментоўкі і дырэкцыёна (аркестравага эскіза);

чацвёрты этап – напісанне партытуры для пэўнага складу аркестра (ансамбля);

пяты этап – слыхавы аналіз партытуры (агучванне ў аркестры ці ансамблі).

Асаблівасці рэалізацыі кожнага этапу работы.

Прынцыпы падбору рэпертуару для інструментоўкі: адпаведнасць тэхнічных і мастацка-выразных магчымасцей пэўнага складу аркестра (ансамбля) для захавання стылю твора.

Гарызантальны і вертыкальны аналіз фактуры арыгінала. Аркестравае (ансамблевае) фактураўтварэнне: сутнасць, праблемы, характар вырашэння.

Састаўленне плана інструментоўкі і аркестравага эскіза: аналіз тэмбравых магчымасцей пэўнага саставу, размеркаванне функцый элементаў фактуры па партыях, групах аркестра (ансамбля). Адрозненні аркестравага эскіза ад менавіта інструментоўкі музычнага твора.

Напісанне партытуры як працэс паступовага пераходу ад агульнага, цэласнага ўяўлення аб творы да падрабязнага, дэталёвага аналізу кожнага элемента фактуры для стварэння партытуры для аркестра (ансамбля) таго ці іншага складу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Практычная рэалізацыя ведаў. Праверка якасці стварэння партытуры шляхам агучвання ў аркестравым (ансамблевым) калектыве.

*Тэма 9. Інструментоўка акампанементу*

Асноўны прынцып інструментоўкі акампанементу – выразнасць, рэльефнасць гучання саліста, хору. Характарыстыка аркестравай (ансамблевай) фактуры ў акампанеменце. Залежнасць аркестравай фактуры ад тэхнічна-мастацкіх магчымасцей саліста, хору.

Спецыфіка інструментоўкі акампанементу салісту-вакалісту: выбар танальнасці, выкарыстанне рэгістраў, асаблівасці песенна-куплетнай формы.

Спецыфіка інструментоўкі акампанементу салісту-інструменталісту. Прынцыпы і прыёмы выдзялення партыі саліста-інструменталіста: празрыстая і насычаная фактура, аркестравае tutti, тэмбравыя спалучэнні ў залежнасці ад інструмента solo, прыёмы гуказдабывання, штрыхі.

Спецыфіка інструментоўкі акампанементу харэаграфічнаму калектыву.

*Тэма 10. Асноўныя прынцыпы графічнага афармлення партытур*

Графічнае афармленне партытур як вынік засваення музычнай «граматыкі» і музычнага «чыстапісання» і як неабходная ўмова спецыяліста (кіраўніка аркестравага, ансамблевага калектыву) высокага прафесіянальнага ўзроўню.

Агульныя патрабаванні да партытуры:

– афармленне вокладак, тытульных лістоў;

– партытурныя сістэмы, акалады, наменклатура інструментаў, тактавыя рысы;

– тэмпавыя, метрычныя, дынамічныя абазначэнні, арыенціры і вольты;

– запіс штыляў, паўз, ліг, кропак, акцэнтаў;

– знакі альтэрацыі, ключы, ферматы, мелізмы, трыёлі і інш.;

– асаблівасці запісу нотнага тэксту для народных інструментаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел III. Практычная інструментоўка

### *Тэма 11. Інструментоўка для беларускага народнага аркестра, аркестра рускіх народных інструментаў і ансамбляў народных інструментаў*

Функцыі асноўных інструментальных груп у беларускім народным аркестры, аркестры рускіх народных інструментаў і асобных інструментаў у ансамблях. Спецыфіка размеркавання функцый у аркестрах і ансамблях. Асноўныя тэмбравыя і функцыянальныя спалучэнні ў аркестрах і ансамблях. Традыцыйныя тэмбравыя спалучэнні ў беларускім народным аркестры, аркестры рускіх народных інструментаў.

Выкладанне гамафонна-гарманічнай фактуры, манадычнай фактуры, змешанай фактуры для аркестраў і ансамбляў народных інструментаў.

Выкладанне tutti ў розных па інструментальным і колькасным складзе аркестрах і ансамблях. Асноўныя прыёмы выкладання мелодыі, гармоніі і баса ў аркестрах і ансамблях. Спосабы вылучэння мелодыі пры інструментоўцы. Узаемадзеянне мелодыі і кантрапункта (падгалоска). Асаблівасці выкладання рытмагарманічнай фігурацыі, педалі, баса ў розных па інструментальным складзе аркестрах і ансамблях.

### *Тэма 12. Пералажэнне сімфанічных партытур для аркестраў і ансамбляў народных інструментаў*

Узаемасувязь спецыяльных ведаў і творчых здольнасцей інструментоўшчыка пры рабоце над сімфанічным пералажэннем. Пералажэнне музычных твораў як прыстасаванне гучання арыгінала да новых умоў, у новым аркестравым складзе. Мэты стварэння сімфанічных пералажэнняў.

Агульныя якасці і ўласцівасці сімфанічнага і народных аркестраў. Адметныя асаблівасці інструментальнага саставу і фактуры сімфанічнага аркестра.

Прынцыпы пералажэння сімфанічных партытур для народных аркестраў і ансамбляў. Улік спецыфікі жанравых і стылістычных асаблівасцей сімфанічнага твора пры пералажэнні, выканальніцкіх магчымасцей і сродкаў выразнасці народнага аркестра, ансамбля. Суадносіны аркестравых груп, выяўленне тэмбравых фарбаў і захаванне тэмбравых кантрастаў. Перапрацоўка фактуры арыгінала: функцыянальная ўзаемасувязь у

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сімфанічным аркестры і размеркаванне функцый у працэсе пераладжэння на адзін з народных саставаў. Дапушчальныя і недапушчальныя змяненні арыгінала пры пераладжэнні з сімфанічнай партытуры на народны склад. Адаптацыя штрыхоў, фразіроўкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

1. *Зряковский, Н. И.* Общий курс инструментоведения / Н. И. Зряковский. – М. : Музыка, 1976. – 472 с.

2. *Кузьмініч, М. Л.* Інструментазнаўства і інструментоўка для аркестраў і ансамбляў беларускіх народных інструментаў: вучэб. дапам. / М. Л. Кузьмініч, Н. П. Яканюк. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры, 2001. – 203 с.

3. *Малахава, І. А.* Самастойная работа студэнтаў пры выкананні семестравых заданняў па інструментазнаўстве і інструментоўцы / І. А. Малахава. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры, 2003. – 76 с.

4. *Назина, И. Д.* Белорусские музыкальные инструменты: самозвучащие, ударные, духовые / И. Д. Назина. – Минск : Наука и техника, 1979. – 144 с.

5. *Назина, И. Д.* Белорусские народные музыкальные инструменты: струнные / И. Д. Назина. – Минск : Наука и техника, 1982. – 120 с.

6. *Назіна, І. Д.* Беларускія народныя музычныя інструменты / І. Д. Назіна. – Мінск : Беларусь, 1997. – 239 с.

7. *Скорабагатчанка, А. В.* Інструментазнаўства / А. В. Скорабагатчанка. – Мазыр : Белый Ветер, 2000. – 179 с.

8. *Шахматов, Н. Н.* Инструментовка для оркестра русских народных инструментов / Н. Н. Шахматов. – Л. : Музыка, 1985. – 120 с.

9. *Шишаков, Ю. И.* Инструментовка для оркестра русских народных инструментов / Ю. И. Шишаков. – М. : Музыка, 1970. – 212 с.

10. *Чулаки, М. И.* Инструменты симфонического оркестра / М. И. Чулаки. – М. : Музыка, 1983. – 173 с.

*Дадатковая*

1. *Барсова, И. А.* Книга об оркестре / И. А. Барсова. – М. : Музыка, 1978. – 208 с.

2. *Блок, В. М.* Оркестр русских народных инструментов / В. М. Блок. – М. : Музыка, 1986. – 80 с.

3. *Браславский, Д. Г.* Основы инструментовки для эстрадного оркестра / Д. Г. Браславский. – М. : Музыка, 1967. – 189 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*4. Гаранян, Г. И.* Аранжировка для эстрадных инструментальных и вокально-инструментальных ансамблей / Г. И. Гаранян. – М. : Музыка, 1983. – 238 с.

*5. Денисов, Э. И.* Ударные инструменты в современном оркестре / Э. И. Денисов. – М. : Сов. композитор, 1982. – 256 с.

*6. Дмитриев, Г. М.* О драматургической выразительности оркестрового письма / Г. М. Дмитриев. – М. : Сов. композитор, 1982. – 256 с.

*7. Зиновьев, В. М.* Инструментовка для оркестра баянов (гармоник) / В. М. Зиновьев. – М. : Сов. композитор, 1980. – 328 с.

*8. Карс, А.* История оркестровки : пер. с англ. / А. Карс. – М. : Музыка, 1989. – 304 с.

*9.* Народныя музычныя інструменты ў мастацкай культуры ХХ стагоддзя: зб. навук. арт. / рэдкал.: Н. П. Яканюк (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. ун-т культуры, 1999. – 142 с.

*10. Пистон, У.* Оркестровка / У. Пистон. – М. : Сов. композитор, 1990. – 464 с.

## Пералік рэкамендаваных сродкаў дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў

– тэсціраванне;
– вуснае апытанне;
– курсавая работа;
– залік;
– экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы студэнтаў па вучэбнай дысцыпліне

Пры складанні заданняў самастойнай работы па вучэбнай дысцыпліне «Інструментазнаўства і інструментоўка» неабходна прадугледзець узрастанне іх складанасці: ад заданняў, якія фарміруюць дастатковыя веды па вывучаным матэрыяле на ўзроўні ўзнаўлення, да заданняў, якія фарміруюць кампетэнцыі на ўзроўні ўжывання атрыманых ведаў у самастойнай творчай дзейнасці.

Пры выкананні самастойных заданняў па інструментоўцы неабходна асобую ўвагу звярнуць на выкарыстанне сучасных камп'ютарных тэхналогій і спецыяльных праграм (нотныя рэдактары «Sibelius», «Finale»).

## Патрабаванні да курсавой работы

Курсавая работа носіць практычна-тэарэтычны характар – гэта вынік практычнай, самастойнай дзейнасці студэнта па стварэнні інструментовак, што дэманструе засваенне тэарэтычнага матэрыялу: метадаў цэласнага аналізу клавіра і партытуры, аркестравай фактуры з выяўленнем аркестравых функцый, авалоданне вопытам графічнага афармлення нотнага тэксту і г. д. Акрамя таго, выкананне курсавой работы прадугледжвае выхаванне творчай ініцыятывы, самаразвіццё і самарэалізацыю асобы студэнта.

У адпаведнасці з вучэбным планам на выкананне курсавой работы адводзіцца 20 гадзін.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэматыка семінарскіх заняткаў

### Семінар I. Інструментальны склад сімфанічнага аркестра

*Пытанні*

1. Сімфанічны аркестр: гісторыя стварэння, эвалюцыя інструментальнага саставу.
2. Агульная характарыстыка асноўных інструментальных груп сімфанічнага аркестра.
3. Група драўляных духавых інструментаў сімфанічнага аркестра.
4. Група медных духавых інструментаў сімфанічнага аркестра.
5. Група струнна-смычковых інструментаў сімфанічнага аркестра.
6. Група ўдарных інструментаў сімфанічнага аркестра.
7. Эпізадычныя інструменты сімфанічнага аркестра.
8. Транспанаваныя інструменты сімфанічнага аркестра.

### Семінар II. Аркестравая фактура як сродак мастацкай выразнасці. Аркестравыя функцыі

*Пытанні*

1. Асноўныя кампаненты музычнай фактуры. Віды фактуры.
2. Кампаненты аркестравай фактуры меладычнай групы: мелодыя, падгалосак, кантрапункт.
3. Прыёмы выкладання мелодыі ў партытуры.
4. Аркестравыя функцыі групы акампанементу і прыёмы выкладання іх у партытуры.
5. Аркестравая функцыя «бас», яе асноўныя разнавіднасці і прыёмы выкладання ў партытуры.
6. Аркестравая функцыя «педаль», яе віды і прыёмы выкладання ў партытуры.
7. Аркестравая фігурацыя, яе віды і прыёмы выкладання ў партытуры.
8. Спецыфіка размеркавання функцый паміж інструментамі ў ансамблях рознага складу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Семінар III. Інструментоўка для беларускага народнага аркестра, аркестра рускіх народных інструментаў і ансамбляў народных інструментаў

*Пытанні*

1. Спецыфіка размеркавання функцый у аркестрах і ансамблях.
2. Функцыянальная ўзаемасувязь асобных інструментаў у групе і аркестравых груп у партытуры.
3. Спецыфіка тэмбравых і рэгістравых спалучэнняў асобных інструментаў і груп аркестра.
4. Асноўныя прыёмы інструментоўкі: запаўненне, яруснае выкладанне галасоў, падвойванні, дубліроўкі.
5. Голасавядзенне, актаўныя падвойванні, акордавае выкладанне пры інструментоўцы (прынцып кампенсацыі, прынцып ладавага імкнення).
6. Выкладанне гамафонна-гарманічнай фактуры для аркестраў і ансамбляў народных інструментаў.
7. Выкладанне манадычнай фактуры для аркестраў і ансамбляў народных інструментаў.
8. Выкладанне змешанай фактуры для аркестраў і ансамбляў народных інструментаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**ІНСТРУМЕНТАЗНАЎСТВА І ІНСТРУМЕНТОЎКА**

*Тыпавая вучэбная праграма для ўстаноў вышэйшай адукацыі*
*па спецыяльнасці 1-18 01 01*
*Народная творчасць (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці 1-18 01 01-02*
*Народная творчасць (інструментальная музыка)*


Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар Л. М. Мельнік

Падпісана ў друк 2015. Фармат 60x84 $^1/_{16}$.
Папера офісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 1,16. Ул.-выд. арк. 0,71. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ